Гэта хто да нас прыплыў

БІЯРАЗНАСТАЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ РЭК І ВАДАЁМАЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

За тры гады іхтыёлагі выявілі ў рацэ Днепр пяць новых відаў рыб і лічаць, што гэта толькі пачатак. Пра гэта сведчаць вылаўленыя ў Дняпры і вывучаныя спецыялістамі прадстаўнікі іхтыяфауны, раней у Беларусі не фіксаваныя, — пячкур светлаплаўніковы, шчыпоўка залацістая, бычок-цуцык, колюшка малая паўдневая і рыба-іголка чарнамор-ская пухлашчокая.

Калі два першыя прадстаўнікі іхты-яфауны, нядаўна прылічаныя да асобных відаў, ужо працяглы час насяляюць беларускія вадаемы, то астатнія, паводле слоў загадчыка лабараторыі іхты-ялогіі Навукова-практычнага цантра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Віктара Рызеўскага, — тыповыя інтэрвенты, прышэльцы з Чорнага мора.

— Клімат у Беларусі паступова змякчаецца, што дазваляе прышэльцам з больш цеплых краеў прыжывацца ў нас. Так і бычок-цуцык, і рыба-іголка, і колюшка, натуральным шляхам пашыраючы арэал свайго распаўсюджвання, паступова адаптуюцца ў вадаёмах краіны, лічыць навуковец.

Інтэрвенты трапілі ў нашы вадаёмы з Кіеўскага вадасховішча, дзе жывуць ужо даўнавата. У самы бліжэйшы час беларускія іхтыёлагі плануюць выявіць яшчэ як мінімум тры віды новых рыб.

— Паводле нашых звестак, у Кіеўекім вадасховішчы шырока распаўсюджаны яшчэ адзін від бычка — галавач, а таксама пугалоўка зорчатая і рыбка сямейства селядцовых — цюлька, — расказаў Віктар Рызеўскі. — Нішто не перашкаджае ім прыплысці па Дняпры да нас “у госці”. Іхгыёлагі ўпэўнены — яны ўжо тут.

З аднаго боку, павелічэнне біяразнастайнасці ў краіне толькі вітаецца і з'яўленне новых відаў рыб павінна радаваць. З іншага — спецыялісты гатовы біць трывогу. Выяўленыя інтэрвенты з'яўляюцца чужароднымі, прамысловай каштоўнасці не маюць, але пры масавым распаўсюджванні будуць актыўна выцясняць іншых, больш каштоўных прадстаўнікоў іхтыяфауны. Так што, сапраўды, есць над чым паразважаць.

Сяргей Мурахоўскі

Источник: Беларусь.-2010.-№ 1.-С.34.